ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК
http://www.zgoda.f2s.com
№ 23 (201) 16 чэрвеня 2001 г.

ВЫБОР–2001

НАЧАЛО НАЧИНАЕТСЯ С КОНЦА



НАШ ВЕРНИСАЖ. «Предвыборное угощение», художник А. СДВИЖКОВ-СТЕН

АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ

Вялотекущая *PR*-кампания предъявления претензий на президентское кресло вступила в завершающую фазу. Президентское Нацсобрание всем и каждому спустило дату окончания многомесячных натуг президентских и оппозиционных пиарщиков. Наконец-то через три неполных месяца вся кампания закончится ритуалом голосования.

В конце концов, белорусские избиратели узнали, когда же заканчивается президентская избирательная кампания. В воскресенье 9 сентября им предложено проголосовать «за» или «против» Александра Лукашенко. А поутру они проснуться, чтобы услыхать о результатах своего, так сказать, волеизъявления. Глубоко вздохнуть и вернуться к повседневной экономике и текущей политике, не искаженными ни потугами пиарщиков, ни, тем более несбыточными надеждами.

Все это впереди. Но пока избирателей, еще и слыхом не слыхавших о каких-то президентских выборах, ожидает накал предвыборных страстей, передающихся в основном политическим путем. Рано или поздно предвыборная лихорадка распространится почти на всех. Судя по различным социологическим опросам, не меньше 70 процентов наших сограждан этой осенью предстанут перед дилеммой: быть или не быть Александру Лукашенко главой белорусского государства.

Тем, кто за Лукашенко, жить и голосовать достаточно просто. Иное дело – тайные и явные инакомыслящие. У них уже сейчас глаза разбегаются от обилия очень демократических имен, которыми вот-вот начнут орудовать сборщики подписей за выдвижение того или иного претендента на место Александра Лукашенко.

Полным ходом идет номинация выдвиженцев. Иногда тихой сапой, как у либерал-демократа Сергея Гайдукевича или у беспартийного Виктора Терещенко. Но признанные оппозиционные фавориты не забывают об агитационном ресурсе самого факта номинации. Первой этот ресурс задействовала группа поддержки Михаила Чигиря. Своего протеже она номинировала публично, с чувством, с толком, с расстановкой.

В штабах Семена Домаша, Павла Козловского, Владимира Гончарика мужские умы пока внимательно наблюдают, что выйдет у женского менеджмента, продвигающего на президентский пост Михаила Чигиря. Поспешать можно и медленно. Тем более, сбор подписей – операция техническая. Ее результативность в основном зависит от финансовых возможностей.

На подписи хватает денег практически у всех выдвиженцев. Радостно потирают руки в предвкушении электоральных гонораров профессиональные сборщики, особенно студенты, прикидывающие, как совместить летнюю экзаменационную сессию с партполитработой. По их мнению, цена за избирательскую подпись будет колебаться от 5 до 20 центов, в зависимости от зажиточности соискателя титула кандидата в президенты и численности его анонимных сборщиков.

Меньше всего потратятся на сбор подписей президент РБ Лукашенко и генсек ПКБ Калякин. В распоряжении у первого – мощный административный ресурс, а на второго будут бесплатно горбатиться многочисленные партийные негры преклонных коммунистических лет.

Несколько сложнее со сбором подписей придется Владимиру Гончарику. Ни один председатель профкома или профорг цеха за так работать на него не собирается. Уже начался торг за льготные путевки и прочие профсоюзные блага. К тому же, после высочайшего президентского наката на своего председателя профсоюзная вертикаль все больше оглядывается на административную. Как бы себе не навредить, собирая подписи за начальника-диссидента.

➲ *Окончание на стр. 3*

ВЫБОР–2001

Избирательная кампания как она есть

ОЛЬГА МИЛОРАДОВИЧ

Избирательная кампания официально стартовала. Палата представителей дала добро на проведение президентских выборов 9 сентября. Отталкиваясь от этой даты и положений Избирательного кодекса, мы составили развернутый план ее основных этапов, чтобы популярным языком растолковать читателям, что, как и когда будет происходить.

Этап 1. Сбор подписей

Сбор подписей – краеугольный камень нынешней избирательной кампании. Согласно Конституции 1996 года, право на выдвижение кандидатов в президенты предоставляется только гражданам Республики Беларусь при наличии не менее 100 тысяч подписей избирателей (по Конституции 1994 года таким правом обладали также депутаты Верховного Совета в количестве не менее 70 человек). Для осуществления трудоемкой процедуры по сбору подписей из числа доверенных лиц выдвиженцев формируются инициативные группы.

Примечательно, что белорусское выборное законодательство никак не регламентирует оплату труда членов инициативных групп. Между тем, наивно было бы полагать, что сотни бедных студентов (а именно они составляют основную часть сборщиков подписей) будут заниматься этой работой только из большой любви к демократии. Сбором подписей в поддержку действующего президента займутся, скорее всего, члены БПСМ и прочих проправительственных молодежных организаций, подписавших на прошлой неделе соглашение о выдвижении кандидатом в президенты Беларуси Лукашенко. Последний, наверняка, не поскупится и раздаст всем сестрам по серьгам.

Со списками своих инициативных групп потенциальные кандидаты должны окончательно определиться уже на этой неделе (последний срок подачи списков для регистрации в Центризбирком – 15 июня). В течение пяти дней ЦИК обязана зарегистрировать инициативную группу и выдать ее членам бланки для сбора подписей и соответствующие удостоверения. Никакими особыми полномочиями и льготами обладатели таких «корочек» не пользуются, а единственная льгота, которая предоставляется кандидату в случае его регистрации, – это бесплатный проезд на всех видах общественного транспорта (кроме такси). Интересно, кто из кандидатов рискнет опробовать на практике данное положение Избирательного кодекса?..

Что касается непосредственно сбора подписей граждан в поддержку лиц, предлагаемых для выдвижения кандидатами в президенты, то в этом году он будет проводиться с 21 июня по 20 июля, в самый пик отпускного сезона. На пору летних отпусков придется и основная часть агитационных мероприятий. Учитывая данное обстоятельство, можно сделать вывод о том, что в эту кампанию самыми «рыбными» местами для членов инициативных групп окажутся дачные участки и пляжи.

Этап 2. Регистрация кандидата

Как правило, этап регистрации оказывается наиболее сложным для возможных кандидатов (именно эта часть работы Центризбиркома вызвала наибольшее количество нареканий и во время осенних выборов в парламент). Реальное число участвующих в президентских выборах кандидатов мы узнаем к 30 июля. Впрочем, если при регистрации неугодного выдвиженца не уличат в фальсификации подписей, не факт, что впоследствии его не лишат этой самой регистрации по причине использования не предусмотренных законодательством финансовых средств.

➲ *Окончание на стр. 3*


АНЕГДОТ

Самый короткий анекдот: белорусские выборы.

* * *

По президентскому указу завод «Горизонт» выпустил новую модель дешевого народного телевизора. На нем только один канал, показывающий БТ. Зато заводские рационализаторы снабдили его подвижными щетками, как ветровое стекло автомобиля. Предполагается, что на экран будут часто плевать.

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ




«... Тогда бы люди понимали: кто есть кто, и кто за кем стоит»

(А. Лукашенко, выступление на заседании Совета республики, 08.06.01)



«У Вика есть венская крыша и инструкторы»

(В. Козиятко, БТ, «Панорама», 09.06.01)



«Есть отдельные бульдозерные попытки по очистке пути стандартов президента, который находится на далеком острове»

(Б. Биккинин, заседание Палаты представителей, 08.06.01)

НАВІНЫ

ШТАБА НЕ БУДЗЕ. Аляксандр Лукашэнка заявіў, што не мае намеру ствараць перадвыбарчы штаб на час правядзення выбараў. Разам з тым ён кажа, што гатовы прыцягнуць 30 чалавек у якасці давераных асобаў. «*Як ва ўсіх*» будзе ініцыятыўная група і ў Лукашэнкі, бо, па ягоных словах, ён не пойдзе на парушэнне заканадаўства. Персанальна над яе складам Лукашэнка пакуль не разважаў.

ЗА АДНАГО. Збіраць подпісы толькі за аднаго кандыдата – такое рашэнне прыняў нечарговы сойм БНФ «Адраджэньне» 9 чэрвеня. У прынятай соймам заяве пацвярджаецца падтрымка магчымага кандыдата Сямёна Домаша. Сябры арганізацыі будуць збіраць подпісы толькі за Домаша. Лідэр партыі Вінцук Вячорка выказаў думку пра неабходнасць тэрміновага правядзення Кангрэсу дэмакратычных сіл «*самае позняе – перад рэгістрацыяй кандыдатаў, але ні ў якім разе не пасля*».



ЗДАРЭННЕ. Напярэдадні выезду аднаго з магчымых кандыдатаў у прэзідэнты генерал-палкоўніка Паўла Казлоўскага ў Маскву для ўдзелу ў перадачы «Времена», з ягоным аўтамабілем адбылося надзвычайнае здарэнне. Раніцай а 6-й гадзіне першы міністар абароны разам з кіроўцам і двума ахоўнікамі выехаў у планавую паездку ў Гомель для сустрэчы з супрацоўнікамі мясцовага выбарчага штаба. Праехаўшы некалькі кварталаў па Мінску, пасля чарговага павароту левае пярэдняе кола раптам выскачыла са свайго месца і павярнулася на 45 градусаў. Кіроўцы мікрааўтобуса РАФ удалося пазбегчы сутыкнення з сустрэчным транспартам і скіраваць машыну ў кювет. Пасля агляду кола высветлілася, што падчас стаянкі ўначы нехта акуратна адкруціў адзін з балтоў, які мацаваў кола да восі. Не выклікае сумневу, што болт нехта адкруціў, а не ён выпаў сам. Сляды зламыснага ўчынку таксама прагляпаліся па алейных плямах і брудзе на ўнутранай паверхні кола. Паводле спецыялістаў, калі б гэтае здарэнне адбылося на трасе пры хуткасці 90–100 км/г, паездка скончылася б трагічна. Сам Павел Казлоўскі расцэньвае гэты факт як «*першую відавочную спробу фізічна зліквідаваць будучага кандыдата ў прэзідэнты*».

КІРАЎНІК ШТАБА. Анатоль Паўлаў, былы прарэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта, абраны ў нядзелю кіраўніком ініцыятыўнай групы Міхаіла Чыгіра для збору подпісаў у падтрымку ягонай кандыдатуры на прэзідэнцкіх выбарах. На сёння колькасць актыўных удзельнікаў ініцыятыўных груп экс-прэм'ера нашай краіны па рэгіёнах перавышае тысячу чалавек. На агульнанацыянальным сходзе для ўтварэння ініцыятыўнай групы Чыгіра бралі ўдзел звыш 300 дэлегатаў з 88 раёнаў Беларусі.

ІСК ДА ГАЗЕТЫ. 14 чэрвеня а 14-й гадзіне ў судзе Кастрычніцкага раёна сталіцы адбылося першае слуханне па іскавай заяве мастацкага кіраўніка дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі Міхаіла Фіндберга да «Белорусской деловой газеты» і журналіста Зьмітра Падбярэзскага. Фіндберг патрабуе выплаціць яму 500 тысяч рублёў з «БДГ» і столькі ж з Падбярэзскага за прычыненыя маральныя страты ў выніку публікацыі артыкула «Концерт для грудной жабы», у якім маэстра, на ягоную думку, выстаўлены чалавекам, які хоча падмяць пад сябе ўсю эстрадна-канцэртную дзейнасць у краіне.

ШТАТ УЗРАСЦЕ. Пракуратура Беларусі мае намер у бліжэйшы час павялічыць свой штат. Гэта сталася вынікам увядзення новых кодэксаў, якія вымагаюць захавання прынцыпу спаборнасці пры разглядзе крымінальных спраў. Па папярэдніх падліках, для нармальнага функцыянавання пракуратуры яе штат трэба істотна павялічыць, інакш тэрміны расследавання і слухання ў судзе крымінальных справаў значна падоўжацца.

ПАЛІТЫЧНЫ. Сябра Маладога фронту Дзяніс Мархаток быў вымушаны забраць дакументы з сярэдняй мінскай школы №86. 11 чэрвеня скончыўся тэрмін ультыматуму, які дырэктар школы Мікола Шэндзераў выставіў Мархатку. Прычынай дзеянняў дырэктара стаўся ціск з боку камісіі па справах непаўнагадовых, якая вынесла Дзянісу Мархатку папярэджанне за ўдзел у акцыі Маладога фронту «Апошні шлях на Бангалор».

АБІТУРЫЕНТ-2001. На чатыры новыя спецыяльнасці сёлета будзе арганізаваны набор у Белдзяржуніверсітэт. Упершыню студэнтаў будуць навучаць дакументазнаўству і дакументальнаму забеспячэнню кіравання, кітайскай мове і літаратуры. На факультэце міжнародных адносінаў з'явіцца таксама спецыяльнасць лінгвакраіназнаўства са спецыялізацыяй «Кітай». А на факультэце фундаментальнай і нетрадыцыйнай медыцыны ўпершыню будуць весці падрыхтоўку лекараў спартыўнай медыцыны. Сёлета БДУ прыме 1850 студэнтаў на дзённае і 480 – на завочнае аддзяленне. Уступны конкурс, па прагнозах, складзе ад 3,5 да 7 чалавек на месца.



ЭКАНОМІКА

Лёгкая прамысловасьць

ТАЦЬЦЯНА ПАПОВА

Напярэдадні чарговых угодкаў свайго існаваньня канцэрн «Беллегпрам» вызначыўся са сваёй стратэгічнай мэтай. У бліжэйшы час усе высілкі супрацоўнікаў канцэрну будуць скіраваныя на ўдасканальваньне вытворчасьці, узым канкурэнтназдольнасьці прадукцыі і дасягненьне новых вышынь эканамічнае эфэктыўнасьці.

Задаволіць патрэбы спажыўцоў у якасных і модных рэчах па некусачых коштах пакуль толькі пляны. Прычым перадумоваў для іх пасьпяховага выкананьня на даляглядзе не назіраецца. Як заявіў на прэс-канфэрэнцыі кіраўнік «Беллегпраму», ягоная ўстанова перажывае цяпер нялепшыя часы. Станоўчыя агулам вынікі зьвядзеньня валютных курсаў у мінулым годзе не прынесьлі карысьці канцэрну. Разам з магчымасьцю маніпуляваць грашыма, зьніклі й дзьве трацiны абаротных сродкаў. Да таго, як нацбанк ураўнаважыў сытуацыю на валютным рынку, з магчымасьці зарабіць на розьніцы курсаў карысталіся прадпрымальнікі-чаўнакі. Яны вывозілі на продаж ў Расію ледзь не трацiну ўсяе прадукцыі 93-х прамысловых прадпрыемстваў «Беллегпраму». Пасьля аб'яднаньня курсаў ваяжэрам стала нявыгадна гандляваць беларускімі таварамі.

Гандлёвая сетка Беларусі летась узяла на рэалізацыю толькі 43 адсоткі ад мінулагодняга аб'ёму. На сілкаваньне молі ўжо нарыхтавана паўтара мільёны пашытых канцэрнам куртачак, спаднічак ды камізэлек (агульны аб'ём выпуску набліжаецца да 19 мільёнаў адзінак прадукцыі). Наўрад ці спатрэбяцца калі-небудзь 10 адсоткаў ад выракбляемага трыкатажу. Нават зь непераборлівымі айчыннымі спажыўцамі цяжка знайсьці паразуменьне, што ж казаць аб разбэшчаных суседзях? Раней беларускае бралі, бо тавар быў недарагі. Цяпер жа рэзкаму рэгрэсу збыту нічога не замінае.

Штодня нагадвае аб сабе й агульны для ўсёй беларускай вытворчасьці боль – зношанасьць фондаў. У лёгкай прамысловасьці яна пасьпяхова пераадольвае мяжу ў 80 адсоткаў. З сыравінай таксама ня ўсё добра. Толькі 8 адсоткаў ільну, што пастаўляецца сёньня на прадпрыемствы канцэрну, можа пахваліцца належнай якасьцю. Астатні лён купляюць у калгасьнікаў толькі для таго, каб не прастойвала абсталяваньне і каб не парушаць зь імі дамоўленасьці. Калі не купіць у іх сыравіну, яна проста згніе.

Такая стратэгія не спрыяе росту рэнтабэльнасьці. У параўнаньні з паказальнікамі 2000 году яна скарацілася ўдвая. Больш як чацьвёртая частка прадпрыемстваў мае сталыя страты.

Канцэранаўцы, як могуць, стараюцца не губляць рашучасьці дзейнічаць. Яны вылучылі для сябе шэраг мэтаў, але пакуль не прыдумалі, як іх дасягнуць. Яны вельмі добра ўсьведамляюць, што канкураваць у іх сытуацыі можна толькі якасьцю, а ня коштам, што для гэтага неабходна прыцягнуць замежныя інвэстыцыі й правесьці тэхнічнае пераабсталяваньне прадпрыемстваў. У плянах таксама павышэньне рэйтынгу гандлёвае маркі прадпрыемства і старраннае імкненьне замацоўваць свае пазыцыі на замежных рынках.

«Беллегпрам» ня можа дачакацца, калі Беларусь прымуць ва Ўсясьветную гандлёвую арганізацыю. Можа, падтрымка гэтага магутнага ўтварэньня неяк дапаможа канцэрнаўцам.

ПАЛІТЭКАНОМІКА

Камароўка, бывай!

ТАЦЬЦЯНА САКУН

Напярэдадні выбараў Беларусь чакае пераменаў. А сярэднестатыстычны грамадзянін, ня маючы спадзеву на паляпшэньне ўласнага дабрабыту з боку дзяржавы з усімі ейнымі эканамічнымі курсамі, любыя зьмены ўспрымае вельмі насьцярожана.



Напрыканцы чэрвеня (а менавіта 23 чэрвеня) Камароўскі рынак дарэшты зьменіць сваё аблічча. У сувязі са зносам гандлёвых кропак, як афіцыйна паведамляецца. Шапікі пакрысе зачыняюцца. *«У чым справа?»* – заклапочана пытаюцца камароўскія пакупнікі. Дзіўна, але бальшыня апытаных сапраўды нічога ня ведае на гэты конт. Адно ходзяць чуткі, што месца будзе аддадзенае пад прадуктовы рынак. (Дарэчы, на месца, дзе можна было набыць танны харч, распачалося будаўніцтва паркінгу).

На некаторых шапіках налепленыя абвестачкі, выдрукаваныя ці напісаныя ад рукі, якія запрашаюць пакупнікоў на «Аквабэль» або «Ждановічы».

Уладальнікі шапікаў распавядаюць, што парушэньняў у адносінах да іх нібыта ніякіх няма. Штомесяц заключалі з адміністрацыяй рынку дамоўленасьць, а два месяцы таму іх папярэдзілі пра спыненьне супрацоўніцтва. Толькі вось нічога не патлумачылі. Але ж хто тут увогуле з кім лічыцца...

Заможныя бізнэсоўцы, тыя, што маюць (мелі) некалькі шапікаў, знайшлі сабе новае месца ў адным з названых вышэй цэнтраў гандлю. Хаця, як самі заўважаюць, напачатку працаваць будзе цяжкз: паўсюль першынствуе канкурэнцыя. Астатнія гандляры-камароўцы пакуль працуюць, жывучы адным днём. Дарэчы, уладальнікі шапікаў не пакінуць бяз працы сваіх наймітаў-гандляроў.

Так, пэўныя выдаткі азначаная катэгорыя мецьме. Але бізнэсоўцы перакананыя, што з голаду яны не памруць. Больш за тое, асобам «каўказкай нацыянальнасьці» заўсёды дапамогуць крэўныя сувязі. Пытаюся, ці мелася ў гандляроў мажлівасьць адкупіцца і ці дамаўляліся яны паміж сабой аб чым-небудзь? Гавораць, што арганізаваныя забастоўкі нічога ня вырашылі, а на спаборніцтва з *Parkingam* яны ня здольныя.

У хуткім часе менчукам давядзецца зьмяніць традыцыю шпацыраваньня па ўлюбёнай Камароўцы, гэтаму ўнівэрсальнаму гандлёваму раёну са зручнай для спажыўцоў сыстэмай камунікацыі. І застанецца калі-нікалі згадваць, як сонейка сьвяціла, дзьмуў лёгкі ветрык, а маладыя апазыцыянэры бескарысьліва прапаноўвалі недзяржаўную прэсу.

Усё ж, каму больш не пашчасьціла ў такой сытуацыі, каго трэба больш шкадаваць, дык гэта катэгорыю так званых вольных гандлярак. Ня блытайце іх, калі ласка, з бабулькамі, што працягваюць вам пакеты і цыгарэты ды сварацца адна з адной за месца пад сонцам. Бальшыня зь іх атрымала добрую (сярэднюю спэцыяльную й нават вышэйшую) адукацыю. Пераважна адзінокія маці зь малымі ці хворымі дзецьмі. Яны самі плянуюць свой працоўны дзень. Падаткаў ня плоцяць. Гуляюць у хованкі зь міліцыянтамі й адказваюць па закону на падставе артыкулаў 147 (адміністрацыйнае парушэньне) і 148 (канфіскацыя тавару). Мая суразмоўца мае дачку-выпускніцу і сынападлетка, які чатыры гады таму захварэў на эпілепсію. Пасьля 23 чэрвеня ў дзяржаўную сфэру (яна выхавацелька) ня пойдзе. Каб пракарміць дзяцей і даць ім адукацыю, будзе наймацца гандляркай да прыватных бізнэсоўцаў.

Яшчэ адзін крок сямігадовай улады, цяжкі й нецьвярозы. «Усё для народа!». А той народ ня цяміць пакуль сваёй выгоды. Дык ці пойдзе на карысьць выбарцам новы вобраз звыклай Камароўкі?! ■

РЭГІЁНЫ

ВІЦЕБШЧЫНА

Палітычная кампанія «Байкот-2001» бярэ пачатак з Віцебску. Ініцыятыва байкоту прэзідэнцкіх выбраў належыць ветэрану адраджэнскага руху на Віцебшчыне Барысу Хамайду, які выступіў з шэрагам заяў на гэты конт. Заявы змешчаны ў Інтэрнэце на сайце агенцтва САНА. Стваральнік сайту Юрась Карпаў кажа, што пазіцыя Хамайды папулярна ў наведнікаў сайту. Адмысловы банер, які заклікае байкатаваць прэзідэнцкія выбары, ужо размешчаны ў абменнай сетцы беларускага Інтэрнэту.

На Віцебшчыне створана Ініцыятыўная група для збору подпісаў пад патрабаваннем падрыхтоўкі альтэрнатыўнага законапраекта «Аб дабрачыннай дзейнасці». Ініцыятары лічаць, што новы варыянт закона мусіць даць адказ на пытанне, што ёсць дабрачынная дапамога. Новы закон павінен падтрымліваць дабрачынныя арганізацыі і спрыяць стварэнню новых. Стварэнне ініцыятыўнай групы адбылося ў межах грамадскай ініцыятывы «Дыялог» у звязку са з'яўленнем Дэкрэта №8, які рэгламентуе парадак атрымання і выкарыстання дабрачыннай дапамогі.

1,5 гектара глебы было забруджана ў выніку аварыі на магістральным нафтаправодзе ў Докшыцкім раёне Віцебскай вобласці, што адбылася напрыканцы мінулага тыдня. На гэты час аварыя ліквідавана. Яе прычынаю быў разрыў трубы, праз які сачылася дызельнае паліва. Эколагі лічаць, што сур'ёзнай страты навакольнаму асяроддзю аварыя не нанесла. Цяпер адмыслоўцы спецыяльнымі машынамі збіраюць плеўкі разлітага паліва і вывозяць яго на ўтылізацыю.

Ужываць ваду ў горадзе Барань Аршанскага раёна небяспечна – да такой высновы прыйшлі спецыялісты па выніках аналізу ўзораў вады са студняў і артэзіянскіх свідравінаў горада. Ва ўсіх пробах зафіксавана перавышэнне дапушчальнага ўзроўню ўтрымання жалеза ў 2–4 разы, а ў дзвюх студнях канцэнтрацыя кішэчнай палачкі была ў 260 разоў большай за норму.

ГРОДНА

Уначы 10 чэрвеня двое злачынцаў у масках напалі на вартавых адной з вайсковых частак Гродна. Бандыты адабралі ў вайскоўцаў два аўтаматы Калашнікава з патронамі і зніклі. На тэрыторыі Гарадзенскай вобласці ўвялі план «Сірэна». Пошукі працягваюцца.

Інспектар Гарадзенскага абласнога камітэта працы на месяц спыніў вытворчасць на сумесным беларуска-нямецкім прадпрыемстве «Саманаплюс» з прычыны парушэння ўмоў працы. Гэтаму кроку папярэднічаў ліст, накіраваны суполкаю Свабоднага прафсаюза прадпрыемства ў Міністэрства працы, дзе былі пералічаны 27 парушэнняў на вытворчасці. Дырэкцыя прадпрыемства сітуацыі не выправіла, да таго ж пагражае не аплочваць працаўнікам вымушанага прастою.

ПАДРАБЯЗНАСЬЦІ

ХРОНІКА АДНАГА ЗДАРЭНЬНЯ

7 чэрвеня старшыня рады ЗБС Крысьціна Сідун, сябры рады Зьміцер Гаўрусік, Сяржук Паўлянковіч і Андрэй Вітушка прыехалі ў Гомельскі дзяржунівэрсытэт, каб распаўсюдзіць першы нумар афіцыйна зарэгістраванай «Студэнцкае газэты» ды чарговы нумар часопіса «Студэнцкая думка».

Паездка была часткай агульнабеларускай акцыі – у гэты ж дзень газэты раздаваліся па навучальных установах Менску ды іншых гарадоў Беларусі.

Прыкладна праз паўгадзіны распаўсюджаньня да Андрэя Вітушкі, які знаходзіўся каля ўваходных дзьвярэй, падышлі два чалавекі ў звычайных строях пры гальштуках і прапанавалі прайсьці зь імі. На просьбу прадставіцца, паказаць дакуманты і патлумачыць маршрут і прычыну невядомыя заламалі Андрэю рукі й паспрабавалі сілай пацягнуць за сабой. Спроба апынулася марнай, тады адзін з нападаючых заламаў мацней руку і пачаў душыць курткай, а пасьля, адпусьціўшы, піхнуў студэнта на шкляныя дзьверы. Дзьверы разьляцеліся. Хлопец ўпаў тварам на падлогу, зьверху на яго ўсеўся адзін з нападаючых і пачаў душыць рукамі й біць галавой аб падлогу.

На крыкі й патрабаваньні выклікаць міліцыю ён адказваў: «*Ніякай міліцыі, я сам прыдушу*». Вакол сабраўся вялікі натоўп выкладчыкаў і студэнтаў, некаторыя прасілі адпусьціць студэнта, адна выкладчыца рвалася ў бой, каб уласнаручна адпомсьціць «бэнээфаўцам».

Сяржук Паўлянковіч і Зьміцер Гаўрусік тройчы тэлефанавалі ў міліцыю, пасьля чаго добраахвотнікі ў пінжаках заламалі ім рукі. Крысьціна Сідун спрабавала вызваліць з рук бандыта шыю Андрэя Вітушкі й выцерці кроў зь яго твару, але здаравенны мужчына адпіхнуў яе, ўдарыўшы ў твар.

Твар Вітушкі пабялеў і ён пачаў губляць прытомнасьць. Толькі тады мужчына ўстаў зь яго й павёў у кабінэт прарэктара, туды ж павялі й астатніх. Па дарозе чуліся крыкі й пагрозы ў бок Андрэя: «*Ты яшчэ не разумееш, з кім зьвязаўся, я цябе паўсюль дастану, табе ня жыць...*» На жаль, дакладна перадаць лаянкі не прадстаўляецца магчымым. У кабінэце мужчына патэлефанаваў нейкаму знаёмаму (называў імя) і папрасіў прывесьці нарад АМОНу ва ўнівэрсытэт. У хуткім часе зьявіліся двое ўзброеных хлопцаў у форме. Студэнтаў абшукалі, у іх забралі пашпарты. Пасьля чаго павезлі ў пастарунак.

На працягу 4 гадзінаў міліцыянты, спасылаючыся на розныя прычыны, адмаўляліся выклікаць хуткую дапамогу. Затое маёр Рачкоў, прысьвяціўшы кожнаму ня меньш за гадзіну, запісаў тлумачальныя аб тым, што адбылося. Пры гэтым ён адмовіў Крысьціне Сідун у прыняцьці заявы з просьбай прыцягнуць да адказнасьці невядомых, што напалі ды зьбілі студэнтаў ва ўнівэрсытэце. За гэты час (з 10 да 15 гадзін) не былі агучаныя прычыны затрыманьня, не прагучала ніякіх тлумачэньняў. Да студэнтаў не прапускалі адваката й грамадзкіх абаронцаў, журналістам і прадстаўнікам грамадзкасьці казалі, што студэнтаў выпусьцілі й яны пьюць у рэстарацыі.

ЗБСаўцам у гэты час абяцалі перадаць справу ў КГБ, прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці. Начальнік упраўленьня ўнутраных спраў Цэнтральнага раёна горада Гомеля палкоўнік міліцыі Смолікаў пагражаў студэнтам, абяцаў адпачынак у КПЗ, водар парашы й разборкі крымінальнікаў за нахабнасьць і беларускую мову.

Асабліва бурны прыступ красамоўя абрынуўся на падначаленых, калі Смолікаў і яго калегі пачулі па радыё «Рокс» расповед пра свае дзеяньні. У гэты момант ён здагадаўся, што тэлефон Крысьціны быў мабільным і мог зьвязвацца ня толькі з Гомелем. На ганку пастарунка сабраўся натоўп каля пяцідзесяці чалавек, якія патрабавалі інфармацыі аб тым, што адбываецца. Паміж слаёным матам гучалі загады «*разагнаць мітынг*», «*абшукаць дзеўку*», а ў гэты момант да пастарунку пад'ехала выкліканая грамадзкімі арганізацыямі Гомеля машына хуткай дапамогі. Пакуль прадзіраючыся скрозь маціршчыну начальнік спрабаваў загадаць не пускаць лекара, той ужо ўвайшоў і пачаў агляд Андрэя Вітушкі.



У выніку высьветлілася, што неабходна ехаць у шпіталь. У суправаджэньні міліцыянта Андрэя павезьлі ў шпіталь, дзе былі накладзеныя швы.

А 16 гадзіне студэнтаў выклікалі ў кабінэт да Смолікава, зноў чуліся пагрозы, а таксама прагучала інфармацыя, што зараз можна пайсьці паесьці, а ў 17.00 трэба вярнуцца да сьледчага для складаньня пратаколаў, інакш будзе абвешчаны крымінальны вышук. Есьці хацелася, але грошы былі сканфіскаваныя. Пратаколы складалі старэйшы інспектар аддзяленьня дазнаньня старэйшы лейтынант Дзьмітры Кавалёў і Ўладзімір Сімак. Фармулёўка пратакола сьпісвалася з заявы, што падалі старэйшы юрыдычны кансультант Гомельскага дзяржунівэрсытэту Мяжэвіч М. М. і прарэктар па гаспадарчай працы Навуменка Н. П. З заявы вынікала, што яны сталіся ахвярамі, у якасьці доказаў Мяжэвіч прыводзіў драпіны.

На той момант было ўжо вядома, што Мяжэвіч тры гады таму кіраваў гэтым аддзяленьнем, быў падпалкоўнікам міліцыі й пазбавіўся пасады за зьверскае зьбіцьцё анархістаў, адзін зь якіх быў зьбіты ў пастарунку да сьмерці.

У 17.30 студэнтаў пагрузілі у закратаваны газік і павезьлі ў суд Цэнтральнага раёна Гомеля. Там правялі некалькі хвілінаў, зноў паехалі ў пастарунак. У пастарунку адбылася яшчэ адна размова са сьледчым і тав. Смолікавым. Студэнтам загадалі а 9 раніцы зьявіцца ў суд і адпусьцілі на ноч, не вярнуўшы газэты й часопісы. З пастарунку студэнты выйшлі ў 18.45 (праз 8 гадзін 45 хвілін пасьля затрыманьня).

А 9 раніцы 8 чэрвеня студэнты, прадстаўнікі гомельскага аддзяленьня Хельсынскага камітэту, сябры «Гарту», прадстаўніца амэрыканскай амбасады Мэган Фіцжэральд, адвакат Уладзімір Пеляпей прыбылі ў суд Цэнтральнага раёна Гомеля.

У 9.45 прыехаў сьледчы Дзьмітры Кавалёў і са словамі «*лепей бы вы сышлі*» папрасіў вярнуцца ў пастарунак. У пастарунку яўна ня ведалі што рабіць і адцягвалі канкрэтную размову.

Блізу 15 гадзіны студэнты былі адпушчаны канчаткова. Зь іх было ўзята абяцаньне пад'ехаць у бліжэйшы час у Гомель для завяршэньня справы. Сьледчы Дзьмітры Кавалёў запісаў падрабязныя тлумачэньні Андрэя Вітушкі, пра тое, як на яго напалі, выдаў накіраваньне на судова-медычную экспертызу. Судова-медычная экспертыза зафіксавала ссадзіны і дробныя рэзаныя раны на ільбе, крывападцёк каля левага вока, крывападцёкі на бакавых паверхнях шыі (з двух бакоў), крывападцёкі й падскурныя разрывы судзінаў у вобласьці плечавых сучляненьняў з заходам на падмышачныя вобласьці, сінякі на грудзях, шматлікія дробныя рэзаныя раны на далонях, рэзана-ўшыбленую рану ўнутранай паверхні левай галёнкі даўжынёй 6 см, паверхневую рэзаную рану правага каленнага сучляненьня даўжынёй 2 см, дробныя ссадзіны на нагах.

Па словах адваката, у дачыненьні да пацярпелага А. Вітушкі захоўваецца верагоднасьць узбуджэньня крымінальнай справы.

Інфармацыя атрымана ад прэс-службы ЗБС

ВЫБОР–2001

Избирательная кампания...

Окончание. Начало на стр. 1

Дело в том, что Избирательный кодекс запрещает какие-либо расходы на избирательную кампанию со стороны самих кандидатов, политических партий и НГО и предусматривает лишь ограниченное государственное финансирование на печатные материалы. Однако бюджет избирательной кампании не ограничивается только расходами на изготовление агитационных плакатов.

Необходимо также учитывать издержки на оплату труда членов инициативной группы, услуги СМИ (вряд ли кандидатов полностью удовлетворят бесплатные пять машинописных страниц текста в республиканской печати), аренду помещения под штаб кампании, транспортные расходы и т.д. При желании «запороть» работу штаба может любой из членов инициативной группы: для снятия кандидата с дистанции достаточно лишь написать соответствующее заявление с указанием некоторых особенностей финансирования избирательной кампании кандидата N.

Не в пример жестким положениям Избирательного кодекса, так или иначе связанных с деятельностью инициативных групп, требования, предъявляемые лично к кандидату, достаточно лояльны. В соответствии с законодательством, президентом Республики Беларусь может быть избран гражданин, достигший 35-летнего возраста и не имеющий не снятых и не погашенных в установленном законодательством порядке судимостей. Кроме того, кандидату необходимо проживать в стране не менее 10 лет непосредственно перед выборами и быть гражданином РБ по рождению. Последняя норма, правда, вызывает недоумение у политологов, так как исходя из положения о том, что Республика Беларусь была образована только в 1991 году, получается, что самыми старшими гражданами РБ по рождению являются десятилетние дети.

По меньшей мере странным выглядит и то обстоятельство, что недееспособным кандидат может быть признан лишь в судебном порядке. Выходит, что конкретное лицо не может быть отстранено от участия в выборах только на том основании, что оно, например, серьезно больно и состоит на учете в психиатрической клинике.

Еще одна законодательная странность заключается в том, что несмотря на то, что президент РБ исполняет также обязанности главнокомандующего вооруженными силами, кандидату в президенты вовсе не обязательно быть годным к воинской службе.

Этап 3. Предвыборная агитация

В соответствии с законодательством, предвыборная агитация начинается со дня регистрации кандидата и заканчивается в ноль часов накануне выборов. В день выборов агитация не допускается: считается, что избирателям необходимо дать время побыть наедине со своими мыслями.

Большинство кандидатов, впрочем, начнет агитацию еще на этапе выдвижения. Делать это можно будет с помощью листовок с биографическими данными кандидата или аналогичных устных рассказов членов инициативной группы, совмещенных со сбором подписей и не содержащих прямой агитации (последняя до регистрации кандидата считается противозаконной). Период же собственно агитации выдастся на август.

В этом году последний месяц лета обещает быть особенно жарким благодаря накалу предвыборных страстей. Ведь не стоит забывать о том, что агитация ведется кандидатами и представителями различных политических сил как за, так и против тех или иных кандидатов, зарегистрированных Центризбиркомом. Еще повоюет БТ и «попиарит» Заметалин, не один раз стукнет кулаком по столу и приложит ладонь к сердцу Лукашенко... Но если вам все-таки удастся не утонуть в потоке политического компромата и устоять под воздействием лукашенковских пиар-чар, то, возможно, утром 10-го сентября вы проснетесь в стране с новым президентом.

ВЫБОР–2001

Начало начинается с конца

Окончание. Начало на стр. 1

Казалось бы, за Михаила Чигиря начнут собирать подписи раньше всех. Не тут-то было. Тут приоритет не у пропагандистского, а у административного ресурса. А вдруг группу Чигиря президентский Центризбирком возьмет и не зарегистрирует под каким-либо благовидным предлогом?

Остальные соискатели президентства из числа тех, кто претендует на голоса против Лукашенко, особо не спешили регистрировать свои инициативные группы. Поскольку менеджеры и пиарщики команд, конкурирующих со сторонниками Чигиря за место в умах и сердцах оппозиционного электората, рассматривали регистрацию инициативных групп как первый «*жест доброй воли*» со стороны властей предержащих.

Скоро о своем окончательном выборе среди оппозиционных, полуоппозиционных и совсем не оппозиционных деятелей власти объявят посредством регистрации кандидатов, собравших с чувствительным запасом положенные 100 тысяч подписей.

Ныне же предвыборный штаб Александра Лукашенко, то бишь президентская администрация, погружен в политические и экономические расчеты. Властям предержащим есть над чем призадуматься. Пришла пора, хотя бы предварительно, решить, чья фамилия будет противостоять Александру Лукашенко в избирательных бюллетенях.

Всем хорош Владимир Гончарик. Номенклатурное прошлое имеется. В оппозиционерах числится. Кой-какой поддержкой у антипрезидентских избирателей пользуется. И властям он удобен, поскольку знает свое профсоюзное место приводного ремня для любой руководящей и направляющей силы.

Одна только закавыка. Президент Лукашенко всерьез верит, что на Западе



выделены астрономические суммы на избирательную кампанию против белорусских властей. То ли 700, то ли 800 миллионов долларов насчитал глава белорусского государства в предвыборной казне своих конкурентов. Естественно, Гончарик на финансовую помощь Запада претендовать никак не сможет. Через КРДС не пройдет, через миссию ОБСЕ аналогично. Стало быть, коль сделать Владимира Гончарика единым кандидатом от оппозиции, не зарегистрировав всех остальных, то страна, мол, лишится инвестиционного ресурса, сравнимого с годовым бюджетом РБ.

Сергей Калякин еще меньше подходит на роль главного конкурента Александру Лукашенко. Всем известно, как не любит партийных товарищей белорусский президент. Западной помощи для Калякина тоже не дождешься, хотя он и шарит под еврокоммуниста. Рейтинг у него минимален. И не нравится он демократам.

Остаются Семен Домаш, Михаил Чигирь и Павел Козловский. С точки зрения политэкономических расчетов каждый из них вполне годится на роль единого и неделимого кандидата от оппозиции. В такой ситуации чиновникам приходится на лету ухватывать или даже угадывать высочайшие пожелания.

Едва Лукашенко публично прогундосил о «*предателях*», некогда бывших его соратниками, бюрократическая мысль тут же заработала. О ком это он? Наверное, о Чигире. Вот он, предатель-ренегат. Референдум 1996 года не признал. И в 1999 собирался батьку президентства лишить.

Или, может, это он о Козловском? Дескать, не переждал спокойно опалу, как Мальцев, чтобы вернуть должность и погоны, в оппозиционеры попер. Опять же, он – генерал, вдруг батька испугается, что Козловский начнет армию баламутить и военный переворот устраивать.

Выходит на регистрацию один Домаш. Но уж больно гродненский выходец амбициозен и потенциально опасен. Неровен час, заняв второе после батьки место, заявит, что Лукашенко украл у него президентство? А там обстановка переменится. Россия на братский союз наплюет. Запад надавит. И нет Лукашенко. А Домаш всегда на месте, не забудет и не простит.

Да, не позавидуешь чиновникам, обязанным принимать конкретные решения. Так или иначе, в ведомстве Михаила Мясниковича придется решать, кто из оппозиционной пятерки пройдет официальную регистрацию, а кому оставаться в неформалах.

Зато уже ясно, кому президент Лукашенко доверил вынести окончательный и официальный вердикт. Этим займется президентская тройка в составе председателя Центризбиркома Лидии Ермошиной, генерального прокурора Виктора Шеймана и председателя Верховного суда Валентина Сукало.

Неопределенность насчет единого кандидата смущает не только оппозиционных избирателей. В некоторой растерянности пребывают чиновники на ниве народного полипросвета, что трудятся в казенных газетах и Белгостелерадио. Кого превозносить до небес, давно известно, а кого хаять и демонизировать, до сих пор не понятно. В самом деле, толку мало палить из пропагандистской пушке по оппозиционным воробьям, которые и регистрацию могут даже не пройти.

Зато полная ясность, как обустроить «*народное волеизъявление*», имеется в рядах низовой президентской вертикали. До сведения местных бюрократов уже довели, что на на улице К. Маркса, 38 есть конкретное мнение. Об их служебном соответствии там будут судить по числу голосов, поданных за «*кандидата в президенты А. Г. Лукашенко*».

От столичного Минска до самых занюханных окраин президентская вертикаль готовится к соцсоревнованию. В борьбе за место передовиков электорального производства все средства хороши. Тем более, чиновникам обещано, что победителей судить не будут. А местных вертикальщиков, проигравших выборы, ждут очень серьезные неприятности.

Игра в президентские выборы по-белорусски идет исключительно по правилам, диктуемым властями предержащими. Меньше всего участники игры думают об избирателях. Неужто им опять удастся обмануть малых сих, сколько президентских кампаний это будет продолжаться?

Ведь когда-нибудь бльщинству избирателей прийдет в голову простейшая мысль: лучше ужасный конец, чем ужас без конца. ■

НОВОСТИ СНГ

УКРАИНА. На Украине очередное продолжение бесконечного сериала под названием Кучмагейт. Беглый охранник украинского президента Николая Мельниченко, обвинявший президента в убийстве Гонгадзе, теперь разродился новой порцией компромата: по его версии, Кучма отмыл в американских банках 1 миллиард долларов. Тем временем, видимо, для поднятия международного имиджа Украины на недосягаемую высоту, председатель счетной палаты и по совместительству президент федерации альпинизма Валентин Симоненко собирается вскоре получить согласие новых властей Непала на наименование одной из безымянных горных вершин Гималаев пиком «Украина». Как известно, безымянную гору высотой 6251 метр, обозначенную на карте как «Р-2», четверка украинских альпинистов покорила 17 мая этого года в ходе экспедиции «Украина–Гималаи-2001». Предварительная договоренность уже была достигнута, однако планам увековечит имя Украины помешало убийство королевской семьи в Непале. Тем не менее, Симоненко не теряет оптимизма и выражает надежду на возобновление переговоров с новым королем.



КИРГИЗИЯ. Один из лидеров Исламского движения Узбекистана (ИДУ) Зубаир ибн Абдулрахим в интервью узбекской службе радио «Азаттык» сообщил, что движение не меняло своего названия на «Исламское движение Туркестана». Начальник управления разведки министерства обороны Киргизии Малик Жумагулов так не считает. Подобное заявление было вызвано обидой узбекских исламистов на киргизские власти, которые мало того, что отняли название, так и еще обвинили в попытках создания халифата не только в Узбекистане, но и во всей Центральной Азии и частично Китае. Хотя исламские радикалы в принципе были бы не против такого развития сценария. Киргизия постоянно подвергается атакам исламских радикалов, идущих на прорыв в соседний Узбекистан. Ожидают неприятностей от исламистов и в этом году. Руководство ИДУ крайне враждебно настроено против ташкентских властей, не собирается прекращать борьбы и отказываться от киргизского маршрута как наиболее удобного для выхода в Ферганскую долину. Соседний с Киргизией Узбекистан наращивает военные приготовления, проведя в начале июня маневры в местах предполагаемого прорыва.



КАЗАХСТАН. Мэр Москвы Юрий Лужков и президент Казахстана Нурсултан Назарбаев неожиданно блеснули в концерте, открывшем дни культуры Москвы в Астане. И мэр, и президент были просто вытащены на сцену столичного конгресс-холла звездой российской эстрады Надеждой Бабкиной. Президент Казахстана не растерялся и сплясал со звездой. А Юрий Лужков не только сплясал, но и спел несколько тематических частушек, причем одну из них довольно фривольного содержания: *«По столице я иду и подарки раздаю: кому сына, кому дочь – лишь бы Астане помочь!»*. В заключение Лужков подарил Назарбаеву кепку. Праздники не помешали казахским властям приступить к борьбе с оппозицией в кибер-пространстве. Как сообщают пользователи Интернета из Казахстана, национальный интернет-провайдер «Казтелеком» продолжает попытки оградить своих клиентов от некоторых публикаций сайта «Евразия» (*http://eurasia.org*). Так, в первые дни июня 2001 года в Казахстане были недоступны материалы этого сайта. В ответ руководители «Евразии» предложили своим читателям пользоваться защитой прокси-серверов, подписываться на рассылку и обращаться к форуму «Евразии», где специально для жертв «Казтелекома» будут размещаться изъятые статьи и адреса доступа.



УКРАИНА. Часть государств СНГ все больше стремится дистанцироваться от России. 6-7 июня в Ливадийском дворце в Крыму прошла встреча государств блока ГУУАМ (Грузия, Украина, Узбекистан, Азербайджан, Молдова). Как известно, данные государства объединяет желание теснейшей интеграции в евро-атлантические структуры и стремление к созданию новых транспортных коридоров в обход России. (Имеется в виду реанимация шелкового пути, нефтепровод Баку–Джейхан, транскаспийский газопровод). Хотя президент России Путин ничего страшного не видит в том, что в рамках СНГ формируются *«организации по интересам»*. Во время проходившей встречи южный берег Крыма выглядел почти как 20 лет назад, когда полуостров посещал Леонид Брежнев. На дорогах через каждые 50 метров – милиционеры и незаметные люди в штатском. На саммите были утверждены Хартия ГУУАМ и договор о зоне свободной торговли. Хартия форума предполагает ежегодные встречи президентов – это высший орган объединения. Высшим исполнительным органом объявлен Совет министров иностранных дел. Выступивший на встрече президент Грузии Эдуард Шеварднадзе намекнул, что в будущем к ГУУАМ могут присоединиться Болгария и Румыния. Министр иностранных дел Украины Анатолий Зленко заявил также, что Бразилия проявила интерес к ГУУАМ в плане экономического сотрудничества. Таким образом, на ялтинской встрече не исключалась возможность со временем превращения ГУАМа в международную организацию, что окончательно сможет похоронить СНГ.

ДАЛЬНЕЕ ЗАРУБЕЖЬЕ

Ирландцы сказали нет

МАКСИМ КОНСТАНТИНОВ

В Европе случился грандиозный конфуз. На национальном референдуме, прошедшем в прошлый четверг, большинство ирландцев выступило против расширения ЕС за счет новых членов. Жертвой народного волеизъявления стал Ниццский договор, предусматривающий реформу ЕС в связи с принятием новых членов.

Итоги референдума оказались неутешительными: 54 процента принявших участие в плебисците проголосовали против, это при весьма низкой 35-ти процентной явке. Две трети ирландцев вообще предпочли остаться дома, зато противники договора сумели отмобилизовать свой электорат. Как ни старались правительство, профсоюзы и даже католическая церковь убедить ирландцев в новых открывающихся перспективах, большинство решило повременить с расширением европейского общежития.


«Договор Ниццы мертв», – с таким заявлением сразу после референдума выступили представители «Национальной платформы», объединившей противников договора (Шинн Фейн, партия «зеленых», пацифисты, левые). Лидер Шинн Фейн Джерри Адамс заявил, что договор нуждается в пересмотре, а Ирландия в настоящих и полноценных дебатах по поводу своего будущего в федеративной Европе.

Противники Ниццского договора считают, что предстоящая реформа евроструктур может ослабить влияние Ирландии в ЕС и поколебать ее военный нейтралитет из-за возможного участия в миротворческих операциях за пределами страны. Предполагаемая централизация многих не устраивает, так как еще больше усиливает влияние в принятии ключевых решений в ЕС стран-гигантов, таких как Франция, Германия и Италия. Существуют также страхи по поводу возможной утраты национального суверенитета и перспектив лишиться финансовой помощи, которая в данном случае может уйти новым членам ЕС. Кроме того, критики концепции *«углубления союза»* и укрепления европейской идентичности акцентировали свое внимание на угрозах ирландским семейным и культурным ценностям в случае расширения полномочий наднациональных структур.

В немалой степени рядового обывателя пугают экономические последствия приема новых стран. Как пишет в своем комментарии обозреватель *Sun*: *«Ирландцы взбешены вмешательством Брюсселя в их процветающую экономику, которая стала одной из самых успешных историй в ЕС»*. Потому и существуют страхи, что экономическому чуду может прийти конец.


Накануне референдума в прессе рисовались самые мрачные прогнозы, что с принятием новых членов в Ирландии исчезнет около пяти тысяч фермерских хозяйств. (А только в одной Польше насчитывается свыше 2,2 миллиона свободных фермеров). После прокатившихся по Европе эпидемии ящура и говяжьих войн только усилились голоса тех, кто ратует за поддержку собственного экологически чистого фермерства, и Ирландия здесь не исключение. Противники договора также заявляют, что могут возрасти ирландские отчисления в евробюджет 2006 года.

Принятый в декабре прошлого года на саммите ЕС в Ницце договор установил основные принципы расширения ЕС на Восток. Согласно договору, с января 2003 года к ЕС могут присоединиться еще 12 стран. Это Венгрия, Польша, Чехия, Румыния, Болгария, Мальта, Кипр, Словакия, а также прибалтийские государства: Литва, Латвия и Эстония. Однако для того, чтобы обрести законную силу, договор должен был быть ратифицирован национальными парламентами всех пятнадцати стран, членов Евросоюза.



Ирландия, в отличие от большинства стран, решила вынести этот болезненный вопрос на референдум. И, по сути дела, приостановила на время объединительный процесс. Тем не менее, председатель Еврокомиссии Романо Проди пообещал поработать с Дублином по поиску путей преодоления вето ирландцев. В данном случае ирландцы оказались не одиноки в своих сомнениях и страхах по поводу будущего своего государства-нации. Достаточно вспомнить датчан, дважды голосовавших по поводу Маастрихтского договора 1992 года и только со второго раза его утвердивших.

Представитель Еврокомиссии по вопросам приема новых членов Гюнтер Верхаген стоически воспринял итоги референдума в Ирландии. По его мнению, протестное голосование по договору не остановит расширения ЕС на восток. Процесс объединения будет проходить в соответствии с ранее намеченными темпами. Верхаген подчеркнул, что референдум не может заблокировать реализацию проекта, от которого зависит политическое и экономическое будущее объединенной Европы. Так что центрально- и восточноевропейским странам особо беспокоиться не стоит. Особенно если учитывать лоббирование расширения ЕС со стороны Франции и Германии, готовых уже к 2004 году одобрить европейскую конституцию.



